

# ДА 55-ГОДДЗЯ
# АЛІНЫ ЭДМУНДАЎНЫ САБУЦЬ

Дарагая Аліна Эдмундаўна!

Чарговую юбілейную дату Вашай біяграфіі мы сустракаем са шчырай удзячнасцю Вам за вернасць мастацтву і нашай літаратурнай сям'і. Жыццёвую энергію і прафесійнае майстэрства Вы прысвяцілі навуцы, а Вашы сэрца і душа несумненна належаць роднаму мастацкаму слову. У яго жыватворнай сіле і натхняльнай прыгажосці Вамі невыпадкова бачыцца эфектыўны сродак выхавання моладзі. Гэтаму вучаць запаветы класікаў. А служыць грамадству, несці людзям гармонію і святло ведаў патрабуе Ваша сумленне. Дарагая Аліна Эдмундаўна! Віншуем Вас з 55-годдзем і шчыра жадаем Вам здароўя, сямейнага дабрабыту, дасягнення ўсіх мэтаў, якія Вы ставіце ў жыцці, заўсёды заставацца такой жа прыгожай і абаяльнай, заставацца сабой і ва ўсім быць прыкладам для сяброў і аднадумцаў. ***З ЮБІЛЕЕМ!***

Калектыў
Гродзенскага абласнога аддзялення
Саюза пісьменнікаў Беларусі

*16 мая 2024 года*

